Установа вышэйшай адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________________ Ю. П. Бондар
«_______»________________ 2014 г.
Рэгістрацыйны № ВД-________/вуч.

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2014

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. Ю. Казленка,* старшы выкладчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*В. І. Саітава,* дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Г. А. Фядосава,* намеснік дырэктара бібліятэкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 21.02.2013);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 16.04.2014)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: А. А. Ляўкевіч
Адказны за выпуск: А. Ю. Казленка

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Развіццё асобы студэнта, фарміраванне яго светапогляду, маральных і эстэтычных ідэалаў, авалоданне сістэмай ведаў і ўменняў пачынаецца з першага дня навучання ва ўніверсітэце. Вельмі важна сфарміраваць у студэнтаў станоўчыя адносіны да навучання, пазітыўны настрой; неабходна з першых заняткаў вучыць першакурснікаў самастойнай вучэбнай рабоце, выклікаць павагу да сваёй спецыяльнасці. Асобае значэнне набывае знаёмства з абранай вучэбнай установай і спецыфікай яе работы, аналіз зместу будучай прафесійнай дзейнасці і вызначэнне пэўных перспектыў вучэбнай дзейнасці, развіццё імкнення да самастойнасці, ініцыятыўнасці ў навучанні, фарміраванне культуры інтэлектуальнай працы, інфармацыйнай культуры.

Агульнай мэтай вышэйшай адукацыі з'яўляецца падрыхтоўка кваліфікаванага спецыяліста адпаведнага ўзроўню і профілю, канкурэнтаздольнага на рынку працы, кампетэнтнага, адказнага, які свабодна валодае сваёй прафесіяй, здольны да пастаяннага прафесійнага росту, сацыяльнага ўзаемадзеяння.

*Мэтай* вывучэння дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» з'яўляецца падрыхтоўка студэнтаў да рацыянальнай арганізацыі вучэбнай дзейнасці ва ўніверсітэце дзеля атрымання прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа.

Гэта мэта дасягаецца праз вырашэнне наступных задач:

– засваенне ведаў аб сістэме падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у Рэспубліцы Беларусь, змесце прафесійнай дзейнасці бібліятэкара-бібліёграфа; асновах арганізацыі вучэбнай, навукова-даследчай і самастойнай дзейнасці студэнта ва УВА; асаблівасцях інтэлектуальнай дзейнасці, метадах павышэння яе эфектыўнасці; асновах работы з інфармацыяй; крыніцах прафесійнай інфармацыі для бібліятэкара-бібліёграфа;

– уменне прымяняць атрыманыя веды для паспяховага навучання і вырашэння вучэбных і прафесійных задач;

– развіццё здольнасці да пастаяннай самаадукацыі;

– фарміраванне станоўчых адносін да абранай прафесіі і вынікаў прафесійнай дзейнасці.

Вучэбная дысцыпліна «Уводзіны ў спецыяльнасць» з'яўляецца першай спецыяльнай дысцыплінай, з якой знаёмяцца студэнты. Таму змест тэм дысцыпліны накіраваны на азнаямленне студэнтаў з прафесійнай тэрміналогіяй, сутнасцю пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фесійнай дзейнасці, тэхналогіямі адукацыі і самаадукацыі. Веды, уменні і навыкі, атрыманыя пры вывучэнні дысцыпліны, з'яўляюцца асновай для засваення агульнаадукацыйных дысцыплін, дысцыплін спецыяльнасці і напрамкаў. Дысцыпліна «Уводзіны ў спецыяльнасць» звязана па змесце з дысцыплінамі, якія вывучаюцца далей: «Тэорыя інфармацыі і камунікацыі», «Інфармацыйная культура асобы», «Бібліятэказнаўства. Тэорыя».

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– гісторыю і структуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый;
– змест будучай прафесійнай дзейнасці;
– асновы арганізацыі вучэбнага і навукова-даследчага працэсу ва УВА;
– асновы самастойнай работы студэнта;
– асновы арганізацыі інтэлектуальнай дзейнасці;
– асновы работы з інфармацыяй;
– прафесійныя рэсурсы для бібліятэкара-бібліёграфа;

*умець:*

– вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;
– узаемадзейнічаць з прафесарска-выкладчыцкім саставам і студэнтамі;
– прапагандаваць прафесію бібліятэкара-бібліёграфа;

*валодаць:*

– навыкамі засваення вучэбнага матэрыялу;
– навыкамі рацыянальнай арганізацыі працоўнага часу;
– акадэмічнымі і сацыяльна-асобаснымі кампетэнцыямі для паспяховага выканання сваіх абавязкаў як студэнта і фарміравання станоўчых узаемаадносін з суб'ектамі навучальнага працэсу.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на замацаванне тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў па дысцыпліне і ўключае наступныя заданні: работа з вучэбна-метадычнай літаратурай; прагляд відэаматэрыялаў аб прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа; наведванне бібліятэк; напісанне эсэ; фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў аб прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа.

Метады навучання ў межах вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійнай кампетэнцыі студэнта. Метада-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лагічную аснову навучання складаюць: тлумачальна-ілюстрацыйныя, рэпрадукцыйныя метады (лекцыя, лекцыя-прэзентацыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў); праблемныя метады (дыялог, напісанне эсэ); метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, напісанне рэфератаў); кантрольна-ацэначныя метады (адказы на семінарах, тэставыя заданні).

На вывучэнне дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» на дзённым аддзяленні вучэбным планам прадугледжана 60 гадзін, з іх 34 аўдыторныя гадзіны (лекцыі – 24 гадзіны, практычныя заняткі – 6 гадзін, семінарскія заняткі – 4 гадзіны).

Рэкамендаванай формай кантролю з’яўляецца залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі |
| **Уводзіны** | 1 | 1 | | |
| **Раздзел І. Бібліятэчна-бібліяграфічная адукацыя ў Беларусі. Прафесія бібліятэкара-бібліёграфа** | | | | |
| *Тэма 1.* Сістэма падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у Рэспубліцы Беларусь. Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў | 1 | 1 | | |
| *Тэма 2.* Прафесія бібліятэкара-бібліёграфа | 6 | 4 | | 2 |
| *Тэма 3.* Мадэль спецыяліста інфармацыйна-дакументнай сферы | 2 | 2 | | |
| **Раздзел ІІ. Арганізацыя вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці студэнта** | | | | |
| *Тэма 4.* Формы арганізацыі вучэбнага працэсу ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Кантроль і ацэнка ведаў студэнта | 2 | 2 | | |
| *Тэма 5.* Навукова-даследчая дзейнасць студэнта | 2 | 2 | | |
| *Тэма 6.* Самастойная работа студэнта. Модульна-рэйтынгавая і рэйтынгавая сістэмы | 4 | 2 | 2 | |
| **Раздзел ІІІ. Пошук і засваенне інфармацыі ў вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці студэнта** | | | | |
| *Тэма 7.* Арганізацыя інтэлектуальнай дзейнасці студэнта | 6 | 4 | | 2 |
| *Тэма 8.* Работа з інфармацыяй | 6 | 4 | 2 | |
| *Тэма 9.* Прафесійная камунікацыя бібліятэкара-бібліёграфа | 4 | 2 | 2 | |
| **Разам...** | **34** | **24** | **6** | **4** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Прадмет, змест і задачы курса «Уводзіны ў спецыяльнасць», яго месца ў сістэме падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў. Кампетэнцыя, якая фарміруецца ў студэнтаў падчас вывучэння курса. Тэарэтыка-практычная накіраванасць курса, яго ўзаемасувязь з цыклам агульнанавуковых, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай працы студэнтаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці курса вучэбнай, метадычнай і навуковай літаратурай.

## Раздзел I. Бібліятэчна-бібліяграфічная адукацыя ў Беларусі. Прафесія бібліятэкара-бібліёграфа

### *Тэма 1. Сістэма падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у Рэспубліцы Беларусь. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў у Магілёўскім дзяржаўным бібліятэчным каледжы ім. А. С. Пушкіна, Гродзенскім дзяржаўным каледжы мастацтваў, Віцебскім дзяржаўным універсітэце ім. П. М. Машэрава. Роля прафесійных бібліятэчных асацыяцый у падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных супрацоўнікаў. Дзейнасць Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі па падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных кадраў.

Гісторыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Арганізацыйная структура ўніверсітэта. Спецыфіка работы адміністрацыі ўніверсітэта розных узроўняў. Самакіраванне ва ўніверсітэце. Выхаваўчая работа ва ўніверсітэце. Студэнцкі прафсаюз універсітэта. Бібліятэка ўніверсітэта. Адпачынак і спорт ва ўніверсітэце.

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў: гісторыя і сучаснасць. Дэканат факультэта. Кафедры факультэта. Прафесарска-выкладчыцкі састаў факультэта. Выдатныя спецыялісты, якія працавалі на факультэце.

Правы і абавязкі студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 2. Прафесія бібліятэкара-бібліёграфа*

Зараджэнне прафесіі бібліятэкара і яе гісторыя. Знакамітыя пісьменнікі, мастакі, навукоўцы, педагогі, грамадскія і палітычныя дзеячы, якія займаліся бібліятэчнай дзейнасцю.

Сацыяльнае запатрабаванне грамадства ў бібліятэчных установах. Праблема крызісу бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, роля бібліятэчных супрацоўнікаў у яе вырашэнні. Прэстыж бібліятэчнай прафесіі.

Прафесійныя патрабаванні да бібліятэкара ў цяперашні час. Этычныя нормы бібліятэчнай прафесіі. Кодэкс прафесійнай этыкі бібліятэкараў Беларусі. Уплыў інфармацыйных тэхналогій на прафесію бібліятэкара-бібліёграфа. Творчасць у бібліятэчнай прафесіі.

Прафесія бібліятэкара ў літаратуры і мастацтве.

*Тэма 3. Мадэль спецыяліста*
*інфармацыйна-дакументнай сферы*

Мадэль спецыяліста як паняцце. Кампетэнцыя і кампетэнтнасць спецыяліста. Паняцце «кваліфікацыя спецыяліста».

Прафесійна значныя якасці для бібліятэкара-бібліёграфа: арганізатарскія, камунікатыўныя, гнасеалагічныя, маральныя.

Прафесійная кваліфікацыя «бібліятэкар-бібліёграф» (вышэйшая адукацыя, першая ступень): мэты падрыхтоўкі, сфера прафесійнай дзейнасці, аб'ект прафесійнай дзейнасці, прафесійныя задачы, акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя, прафесійныя кампетэнцыі.

## Раздзел ІІ. Арганізацыя вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці студэнта

*Тэма 4. Формы арганізацыі вучэбнага працэсу ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Кантроль і ацэнка ведаў студэнта*

Вучэбныя планы як аснова арганізацыі вучэбнага працэсу. Расклад вучэбных заняткаў. Нормы нагрузкі студэнта.

Формы арганізацыі вучэбнага працэсу ва ўстанове вышэйшай адукацыі: тэарэтычныя, практычныя, камбінаваныя і кантрольныя заняткі. Аўдыторная і пазааўдыторная работа. Лекцыя як тэарэтычная форма навучання. Функцыі лекцыі. Культура ўспрымання лекцый. Правілы арганізацыі работы на лек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі. Канспект лекцыі як вынік засваення яе зместу. Прыёмы канспектавання лекцыі. Практычныя і лабараторныя заняткі, іх мэты і задачы. Віды семінарскіх заняткаў. Падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў. Кансультацыя як форма аказання дапамогі студэнтам у іх самастойнай працы. Факультатывы і курсы па выбары. Вытворчая і вучэбная практыкі.

Бягучая і выніковая атэстацыя студэнтаў. Бальная сістэма ацэнкі ведаў. Крытэрыі ацэнкі ведаў. Крэдытна-заліковая сістэма ацэнкі ведаў. Значнасць ацэнкі ведаў. Інструменты ацэнкі ведаў.

Асноўныя прынцыпы арганізацыі кантролю ведаў. Функцыі кантролю. Праблема аб'ектыўнасці кантролю. Формы педагагічнага кантролю: экзамены, залікі, вуснае апытанне, пісьмовыя кантрольныя працы, тэсты, рэфераты, калёквіумы. Віды экзаменаў. Падрыхтоўка да экзамену. Тэсціраванне як форма кантролю ведаў студэнтаў. Курсавыя і дыпломныя работы.

### *Тэма 5. Навукова-даследчая дзейнасць студэнта*

Навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Задачы навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў. Узроўні падрыхтаванасці студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці.

Формы навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў: выкананне студэнтамі практычных заданняў, курсавых і дыпломных работ; студэнцкія навуковыя гурткі; удзел у студэнцкіх навуковых канферэнцыях, алімпіядах, рэспубліканскіх конкурсах. Рэспубліканскія і міжнародныя навуковыя канферэнцыі ў галіне бібліятэчнай справы. Сістэма матывацыі студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці.

### *Тэма 6. Самастойная работа студэнта. Модульна-рэйтынгавая і рэйтынгавая сістэмы*

Самастойная работа студэнта як форма вучэбнага працэсу. Асноўныя накірункі самастойнай работы студэнтаў. Віды самастойнай работы студэнтаў. Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Умовы і крытэрыі паспяховага выканання самастойнай работы. Сістэма заданняў для самастойнай работы. Матывацыя і кантроль самастойнай работы.

Модульна-рэйтынгавая і рэйтынгавая сістэмы як адлюстраванне якасці самастойнай работы студэнтаў і кантролю ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Балы і выніковыя адзнакі ў модульна-рэйтынгавай сістэме. Умовы модульна-рэйтынгавай сістэмы. Роля вучэбна-метадычных комплексаў у арганізацыі самастойнай работы студэнтаў.

Тэхналогія самаадукацыі. Матывацыя самаадукацыі.

## Раздзел III. Пошук і засваенне інфармацыі ў вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці студэнта

*Тэма 7. Арганізацыя інтэлектуальнай дзейнасці студэнта*

Асаблівасці інтэлектуальнай дзейнасці. Разумовая працаздольнасць і яе дынаміка. Біярытмы чалавека. Умовы эфектыўнасці інтэлектуальнай дзейнасці. Гігіена інтэлектуальнай дзейнасці. Ежа для мозгу.

Самаразвіццё адчуванняў. Развіццё ўспрымання. Развіццё ўяўленняў. Канцэнтрацыя ўвагі. Развіццё памяці. Культура публічнага выступлення.

Навуковая арганізацыя працы. Арганізацыя працоўнага месца. Рацыяналізацыя прыёмаў і метадаў працы. Арганізацыя ўвагі і засваення інфармацыі. Прыёмы паспяховага запамінання і разумення матэрыялу.

Самаменеджмент студэнта. Пастаноўка асабістых мэт. Планаванне асабістых задач. Неабходнасць прыняцця рашэнняў. Прынцыпы планавання часу.

*Тэма 8. Работа з інфармацыяй*

Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь як база для атрымання інфармацыі. Бібліятэка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Віды каталогаў бібліятэк і асаблівасці пошуку ў іх. Электронныя каталогі і базы даных бібліятэк Рэспублікі Беларусь і замежных краін. Асаблівасці пошуку інфармацыі ў Інтэрнэце.

Тэхналогія работы з інфармацыяй. Мэты работы з інфармацыяй. Работа з кнігамі, часопісамі, газетамі, слоўнікамі, энцыклапедыямі, электроннымі дакументамі. Віды канспектаў, планаў, тэзісаў, рэфератаў. Анатацыі. Ключавыя словы. Прадметныя рубрыкі. Прыёмы скарачэння тэксту пры запісе. Структура і афармленне пісьмовай працы.

Работа з дакументамі справаводства. Работа з карэспандэнцыяй. Камунікацыя па тэлефоне і электроннай пошце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 9. Прафесійная камунікацыя бібліятэкара-бібліёграфа*

Знакамітыя спецыялісты Беларусі і замежных краін, якія даследуюць пытанні бібліятэчнай справы.

Прафесійныя перыядычныя выданні па бібліятэчнай справе.

Выдавецтвы, якія выпускаюць кніжную прадукцыю па бібліятэчнай справе. Інфармацыйныя і бібліяграфічныя выданні па бібліятэчнай справе. Бібліяграфічная інфармацыя як крыніца прафесійнай інфармацыі.

Электронныя прафесійныя выданні па бібліятэчнай справе ў глабальнай сетцы. Базы даных бібліятэк Рэспублікі Беларусь па бібліятэчнай справе і бібліяграфіі. Блогі бібліятэкараў і бібліятэчных супольнасцеў. Бібліятэкі і бібліятэкары ў сацыяльных сетках.

Міжнародныя і рэспубліканскія канферэнцыі па праблемах бібліятэчнай справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Библиотекарь: выбор профессии. Мастер-класс профессора Ю. Н. Столярова / ред.-сост. Ю. Н. Столяров. – М. : Либерея-Бибинформ, 2010. – 175 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 124).

*2. Водзинский, Д. И.* Ум человека и его развитие : пособие / Д. И. Водзинский. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2006. – 104 с.

*3.* Вышэйшая адукацыя. Першая ступень : ОСРБ 1-23 01 11-2008 : спецыяльнасць 1–23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) : кваліфікацыя – Бібліятэкар-бібліёграф. – Введ. 12.06.2008. – Мінск, 2008. – 38 с. – (Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь).

*4. Гецов, Г.* Как эффективно работать с информацией из книг, газет, журналов и других источников: приемы традиционные и новые : практ. пособие / Г. Гецов. – 8-е изд. – М. : МГУ, 2006. – 121 с.

*5. Григорович, Я. Д.* Организация самостоятельной работы студентов института культуры : учеб.-метод. пособие / Я. Д. Григорович ; Мин. ин-т культуры. – Минск , 1991. – 69 с.

*6. Зубра, А. С.* Искусство успешно учиться. Культура умственного труда : пособие для студентов / А. С. Зубра. – Минск : Дикта, 2011. – 344 с.

*7. Кузьмініч, Т. В.* Інфармацыйная культура асобы : вучэб. дапам. / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2002. – 168 с.

*8. Паўлава, С. А.* Уводзіны ў спецыяльнасць : метад. дапам. / С. А. Паўлава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 56 с.

*9. Пионова, Р. С.* Педагогика высшей школы : монография / Р. С. Пионова ; Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск : БГПУ им. М. Танка, 2001. – 250 с.

*10. Соколов, А. В.* Науки об информации и библиотекарь : проф.-мировоззрен. пособие / А. В. Соколов. – М. : Литера, 2010. – 143 с. – (Серия «Современная библиотека» ; вып. 90).

*11.* Справочник библиотекаря / Ванеев, А.Н. [и др.]. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2001. – 439 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Сукиасян, Э. Р.* Библиотечная профессия и кадровый менеджмент : избран. ст., 2004-2011 / Э. Р. Сукиасян. – СПб. : Профессия, 2011. – 430 с.

*Дадатковая*

*1. Акимкина, А. В.* Имидж библиотечной профессии / А. В. Акимкина // Молодые в библиотечном деле. – 2012. – № 4. – С. 28–32.

*2. Акулич, В. А.* Десять веков книжной культуры: библиотечное дело в Беларуси: история и современность / В. А. Акулич, Н. В. Клименкова // Библиотечное дъло. – 2009. – № 24. – С. 11–14.

*3. Владимирская, О. Д.* Самообразование: пять шагов : пособие / О. Д. Владимирская. – СПб. : Экспресс, 2006. – 101 с.

*4. Демешко, Л. А.* Высшее библиотечное образование в Республике Беларусь: к 65-летию основания / Л. А. Демешко, С. В. Зыгмантович // Библиотечное дело. – 2009. – № 24. – С. 18–23.

*5. Жданова, Т. А.* Библиотекарь-профессионал : какой он сегодня? / Т. А. Жданова // Библиотековедение. – 1994. – № 4. – С. 90–97.

*6. Зайверт, Л.* Ваше время в ваших руках / Л. Зайверт. – М. : Интерэксперт, 1990. – 169 с.

*7. Змеев, С. И.* Как научиться учиться: технология самостоятельного чтения / С. И. Змеев. – М. : Маршрут, 1997. – 59 с.

*8. Зыгмантовіч, С. В.* Фарміраванне прафесійных кампетэнцый будучых бібліятэкараў / С. В. Зыгмантовіч// Бібліятэчны свет. – 2005. – № 2. – С. 28–31.

*9. Зяблицева, М. А.* Моментальные приемы запоминания. Мнемотехника разведчиков / М. А. Зяблицева. – Ростов-на-Дону : Феникс, 2007. – 150 с. – (Серия «Психологический практикум»).

*10. Кинг, Э.* Как пользоваться библиотекой : практ. рук-во для учащихся и студентов : пер. с англ. / Э. Кинг. – Челябинск : Урал, 1997. – 154 с.

*11. Компаниченко, В. Н.* Самоорганизация личности – путь к расцвету человечества / В. Н. Компаниченко ; Дальневост. регион. науч. центр АЕН РФ, Центр изуч. пробл. будущих поколений. – Хабаровск : Центр изуч. пробл. будущих поколений, 1994. – 50 с.

*12.* Культура учебного труда : учеб. пособие / А. А Деркач [и др.] ; под общ. ред. А. А. Деркача ; Рос. акад. гос. службы при

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Президенте Рос. Фед. – М. : Изд-во РАГС, 2006. – 131 с.
*13. Лукас, Б.* Обучение без торможения: эффективная методика, позволяющая безнаказанно превысить скорость усвоения и запоминания любой информации / Б. Лукас. – М. : Эксмо, 2005. – 350 с. – (Психологический бестселлер).
*14. Лурия, А. Р.* Маленькая книжка о большой памяти: ум мнемониста / А. Р. Лурия. – М.: Эйдос, 1994. – 96 с.
*15. Панова, Н.* Обаятельный, привлекательный, компетентный / Н. Панова // Библиотека. – 2013. – № 4. – С. 70–71.
*16. Примаковский, А. П.* О культуре чтения: методы самостоятельной работы с книгой в свете научной организации умственного труда / А. П. Примаковский. – М. : Книга, 1969. – 158 с.
*17. Смайлс, С.* Саморазвитие умственное, нравственное и практическое / С. Смайлс. – Минск : Універсітэцкае, 2000. – 408 с.
*18. Степанов, В. К.* Поисковые системы Интернет: эволюция и перспективы / В. К. Степанов // НТБ. – 1998. – №2. – С. 89–93.
*19. Стрелкова, И. Б.* Формирование кадровых ресурсов библиотек в новой информационной среде : науч.-практ. пособие / И. Б. Стрелкова. – Минск : Новое знание, 2008. – 230 с. – (Профессионалам библиотечного дела).
*20. Сукиасян, Э. Р.* Повышение престижа библиотечной профессии. Идеи и предложения [Электронный ресурс] / Э. Р. Сукиасян. – Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2005/disk/63.pdf. – Дата доступа: 23.01.2014.
*21. Сукиасян, Э. Р.* Что должен знать и уметь библиотекарь? / Э. Р. Сукиасян // Библиотека. – 2002. – № 8. – С.52–53.
*22. Фонотов, Г. П.* Таков он, библиотекарь: популярная беседа в форме диалога для библиотекарей и не только .... / Г. П. Фонотов. – М. : Либерея, 1997. – 173 с.
*23. Шейнов, В. П.* Как управлять собой: приемы использования скрытых ресурсов личности / В. П. Шейнов. – 2-е изд. – Минск : Харвест, 2007. – 750 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Рэдактар А. А. Ляўкевіч
Тэхнічны рэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,53. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ